**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2022 г.**

**<u>Мерапрыемствы да Года гістарычнай памяці</u>**
**<u>Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга РБ</u>**

З 5 па 13 мая ў публічных бібліятэках ДУК праведзена патрыятычная акцыя да Дня Перамогі «Великим тем годам святую память сохраняя».

**5 мая**

У рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» прайшоў музычна-паэтычны летапіс «Стихи, рожденные войной», прымеркаваны да свята Дня Перамогі. Для навучэнцаў 10 класа СШ № 3 г. Кобрына прагучалі вершы паэтаў Мусы Джаліля, Юліі Друнінай, Кастуся Сіманава, Пімена Панчанкі, Петруся Броўкі, Андрэя Дзяменцьева. Бібліятэкары пазнаёмілі гасцей з гісторыяй стварэння песень «Священная война», «Катюша», «Смуглянка», «Алеша». Вакальная група «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавала музычныя нумары.

ЦБ, 25 чал.

**5 мая**

У бібліятэцы адбылося пасяджэнне аматарскага клуба «Светоч». На ўрок мужнасці «О Родине, о подвигах, о славе» прыйшлі вучні 6-х класаў СШ №1 г. Кобрына. Дзеці прагледзелі прэзентацыю «Маленькие герои большой войны», адказалі на пытанні віктарыны «Дети героической страны».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 22 чал.

**6 мая**

Конкурс чытальнікаў «Мы о войне стихами говорим» прайшоў у бібліятэцы сярод вучняў 1-4 класаў. Удзельнікаў конкурсу ацэньвала журы, якое складалася з супрацаўнікоў ДК і настаўнікаў школы. Усе ўдзельнікі сур'ёзна падрыхтаваліся да конкурсу. Пасля абмеркавання журы вылучыла пераможцаў па ўзроставых катэгорыях, якія атрымалі прызы, а ўдзельнікі конкурсу - салодкія частункі.

Навасёлкаўская ПБ, 25 чал.

**6 мая**

На вечар франтавой лірыкі «С кровавых не пришедшие полей», прымеркаваны да Дня Перамогі, сабраліся падапечныя аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН.

Для гасцей прагучалі музычныя кампазіцыі ў выкананні клуба «Встреча» Кобрынскага ТЦСАН і вакальнай групы «Фантазия» Кобрынскай

цэнтральнай раённай бібліятэкі: «Синий платочек», «Не возвращайся», «Катюша», «Смуглянка», «Идет солдат по городу», «Вернись сынок», «Любовь моя», «Тучи в голубом», «Аист на крыше» і інш. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Кандрашук прачытала свае вершы, прысвечаныя Вялікай Перамозе.

ЦБ, 26 чал.

**6 мая**

На патрыятычнай гадзіне «Их детство забрала война» бібліятэкары расказалі вучням Дзівінскай сярэдняй школы пра піянераў-герояў Савецкага Саюза. Дзеці прагледзелі прэзентацыю «Дзеці - героі Вялікай Айчыннай вайны», прачыталі вершы пра юных герояў. Падчас мерапрыемства гучалі песні ў выкананні Максіма Пушылы, Ульяны Замжалавай, Кацярыны Смеховіч, Анастасіі Казеевай, Кастуся Тарарая, Леры Брэнковіч. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава «Праз вайну, праз памяць, праз лёс».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 19 чал.

**8 мая**

«Дыхание Родины в каждой строке» - так называлася прэзентацыя, што прайшла ў бібліятэцы, сборнікаў паэзіі мясцовай пісьменніцы Надзеі Момлік «Перрон счастья» і «Я не стамлюся піць з вытокаў». Кіраўнік гуртка пры Доме рамёстваў Ларыса Дарашук прачытала верш «Дывэньскэ высилле» і прадэманстравала касцюм мясцовай свацці. Прэзентацыя суправаджалася музычнымі нумарамі. Песня ў выкананні Таццяны Гурыш суправаджалася відэапрэзентацыяй пра Дзівін. Пад канец мерапрыемства Надзея Момлік падарыла новыя сборнікі ў бібліятэку.

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 18 чал.

**10 мая**

У рамках Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў гістарычны круіз «Дзяржаўныя сімвалы – нацыянальны гонар» для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа. У ходзе мерапрыемства былі прадстаўлены слайд-прэзентацыі «Сімвалы дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь», «Геральдыка Кобрыншчыны». Прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення сімвалаў нашай дзяржавы, малой радзімы, даведаліся аб ролі і значэнні сімволікі ў жыцці кожнага чалавека і краіны ў цэлым, праслухалі гімн, адказалі на пытанні экспрэс-віктарын.

ЦБ, 28 чал.

**11 мая**

Для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання адбылася патрыятычная гадзіна «Сімвалы малой радзімы». Прысутныя прагледзелі слайд-прэзентацыі «Сімвалы дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь», «Геральдыка Кобрыншчыны» і пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення сімвалаў нашай дзяржавы. Да мерапрыемства падрыхтавана выстава «У сімвалах – гісторыя краіны» з серыі «Святочныя даты нашай дзяржаўнасці».

ЦБ, 26 чал.

**12 мая**

Дзень ваенна-патрыятычнай кнігі «В книжной памяти мгновения войны» прайшоў у бібліятэцы. Літаратурна-музычную кампазіцыю «Беларусь героическая» наведалі вучні 7-11 класаў. Вядучыя расказалі пра асноўныя этапы Вялікай Айчыннай вайны, чыталі вершы. У выкананні Асіпук Кацярыны прагучала песня «Бессмертный полк». Дадаткам мерапрыемства сталі відэаролікі «Если б камни могли говорить», «Лясная песня», «Тишина», «Наследники Победы». Прысутныя адказвалі на пытанні віктарыны «Вопросы из солдатского вещмешка». Увагу наведвальнікаў прыцягнулі кніжныя выставы «Читай, чтобы знать и помнить», «И помнить страшно, и забыть нельзя».

Арэхаўская ПБ, 25 чал.

**12 мая**

У рамках святкавання 77-годдзя Вялікай Перамогі, бібліятэкар сумесна з іерэем Георгіем і нядзельнай школай павіншавалі на хаце вязня канцлагера часоў Вялікай Айчыннай вайны Дземчанка Ганну Гаўрылаўну. Дзеці павіншавалі кветкамі, паштоўкамі, а таксама прачыталі вершы і праспявалі вайсковую песню «О той весне».

Гарадзецкая ПБ, 23 чал.

**24 мая**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка, празаікам, публіцыстам Анатолем Брытуном. Аматараў літаратурнай творчасці Анатолій Арцёмавіч пазнаёміў са сваёй біяграфіяй, адказаў на пытанні. Гучала тэма малой радзімы, гістарычнага мінулага роднага краю, што асабліва актуальна ў Год гістарычнай памяці. Супрацоўнікамі бібліятэкі падрыхтаваны прэзентацыя і адкрыты прагляд літаратуры «Анатоль Брытун. Невыдуманыя лёсы».

ЦБ, 25 чал.

## <u>Мерапрыемствы да Міжнароднага дня сям’і</u>

**14 мая**

У бібліятэцы адбылася гутарка-дыялог «Семья. Брак. Венчание», на якую сабраліся члены аматарскіх клубаў «Золотые россыпи» і «Дивинчанка». На сустрэчу быў запрошаны ігумен храма Божага Нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы ў аг. Дзівін протаіерэй Валерый Барадзін. Супрацоўнік ТЦСАН Дзмітрый Чаплюн павіншаваў Ніну Кірылаўну Люльковіч (члена клуба) з юбілеем і правёў трэнінг «Тепло семейного очага». Прысутныя паглядзелі відэапрэзентацыю «Семья – источник вдохновенья». Надзея Момлік прачытала верш «Семейный альбом». Да мерапрыемства была афармлена кніжная выстава «Ничего не бывает на свете роднее» і выстава народнай творчасці Дзівінскага ДР «Планета под названием семья».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 17 чал.

**15 мая**

У бібліятэцы прайшла конкурсна-гульнявая праграма «Я+ТЫ+Дети = лучшая семья на свете». У праграме прынялі ўдзел 4 сям'і: Тарасюк, Матвеюк, Антанян, Вашчук. Бацькі разам з дзецьмі з задавальненнем удзельнічалі ў конкурсах «Утренние сборы», «Родители-эрудиты», «Кто сильнее». Усе каманды былі ўзнагароджаны граматамі пераможцаў па намінацыях: «Самая активная семья», «Самая дружная семья», «Самая талантливая семья», «Самая обаятельная семья».

Пескаўская ПБ, 19 чал.

**15 мая**

Літаратурна-музычную сустрэчу «История моей семьи в истории родного края» наведалі шматдзетныя сем'і, якія з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў і самымі актыўнымі чытачамі. У намінацыі «Самая читающая многодетная семья» сем'і былі ўзнагароджаны граматамі і падзячнымі лістамі, памятнымі сувенірамі. Вучні 4 класа чыталі вершы пра сям'ю, адказвалі на пытанні віктарыны пра танцы з шумавымі інструментамі, пазнаёміліся з кніжнай выставай «Дзень сям'і». Мерапрыемства суправаджалася музычнымі нумарамі ў выкананні дуэта гарманістаў «Кобринский гармоник», сольным выкананнем Р. Мацука і скрыпкі О. Сацюк.

Магдалінская ПБ, 29 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**14 мая**

У бібліятэцы адбылася прэзентацыя другога выпуску літаратурнага альманаха «Лірычны настрой», які пабачыў свет у выдаўца Ефціфеевай Наталлі Пятроўны. На мерапрыества завіталі сябры і знаёмыя літаратараў, прадстаўнікі сістэмы адукацыі Кобрыншчыны і школьнікі.

Напачатку мерапрыемства дырэктар Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Ларыса Легацюк расказала пра літаратурны клуб, яго работу і дасягненні. Затым паэты адзін за адным расказвалі пра сябе і чыталі свае вершы. Вядучай прэзентацыі, кіраўніком клуба «ПаэтыКо», членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталляй Кандрашук (Ефціфеевай) быў прадстаўлены кожны аўтар альманаха. Упрыгожваннем мерапрыемства сталі аўтарскія песні на словы кобрынскіх паэтаў. Дапоўнілі творчы вобраз літаратурнага клуба кніжная выстава «ПАЭТЫчны КОбрын» і выстаўка рукадзельных работ «паэтыкаўцаў».

ЦБ, 61 чал.

**23 мая**

Малодшыя вучні Дзівінскай сярэдняй школы з мамамі і бабулямі былі запрошаны на бенефіс кнігі «Книга, которую ждали». Пісьменніца Надзея Момлік зрабіла агляд сваіх першых пяці дзіцячых кніг, з якіх дзеці чыталі

вершы пра жывёл, расліны, цікавыя падзеі з жыцця. Асаблівая ўвага была нададзена новай кнізе «Ключы ад зімы». Новая кніга незвычайная тым, што аўтарамі ілюстрацый да яе з'яўляюцца дзеці. Яны з цікавасцю глядзелі прэзентацыю «В гостях у книжки», пазнавалі свае малюнкі, падзяляліся ўспамінамі пра іх стварэнне. Пад канец мерапрыемства аўтар падарыла кнігу ў бібліятэку, а жадаючыя змаглі набыць кнігу з аўтографам аўтара на памяць.

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 24 чал.

## **Выдавецкая дзейнасць**

Да Года гістарычнай памяці метадыстамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу сумесна з бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі распрацавана краязнаўчая інтэрактыўная віктарына «Кобрын: ад мінулага і сучаснага». Віктарына размешчана на сайце ў раздзеле «Смекалинка».

Зыбайла К. І.
Тэл. 3 85 81